1. *Дроздова, Н. В.* Компетентностный подход как новая парадигма студентоцентрированного образования / Н. В. Дроздова, А. П. Лобанова. – Минск : РИВШ, 2007. – 100 с.

2. *Позняков, В. В.* Инновационная компетентность специалиста / В. В. Позняков // Наука и инновации. – 2008. – № 7. – С. 65–69.

***В. В. Навіцкая,*** *наместнік дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце музея «Замкавы комплекс “Мір”», саіскальнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# НАВУКОВА-ЭКСПАЗІЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ ГІСТАРЫЧНАГА І КОМПЛЕКСНАГА ПРОФІЛЯЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Сучасны музей актыўна развіваецца, улічваючы патрабаванні грамадскасці і звяртаючыся да новых формаў работы з наведвальнікамі. Аднак на першым месцы застаецца экспазіцыя, якая з’яўляецца адным з асноўных каналаў камунікацыі музея. Менавіта яна як прадметна-прасторавае асяроддзе, якое мае форму і выразнасць, ажыццяўляе камунікатыўную сувязь і тым самым «адкрывае» музей наведвальніку.

Падаюцца розныя трактоўкі паняцця «музейная экспазіцыя». Аднак мы спынімся на тым тлумачэнні, якое прадстаўлена ў «Слоўніку актуальных музейных тэрмінаў», апублікаваным у 2009 г. у часопісе «Музей». У ім экспазіцыя вызначаецца як асноўная форма прэзентацыі музеем гісторыка-культурнай спадчыны ў выглядзе штучна створанай прадметна-прасторавай структуры. Аднак далей дадаецца, што сучасная музейная экспазіцыя з’яўляецца асаблівым сінтэтычным навукова-мастацкім творам, які ствараецца ў адпаведнасці з адзінай ідэйнай задумай, якая вызначае прынцып адбору, групоўкі і інтэрпрэтацыі экспанатаў на аснове навуковага, сцэнарнага і мастацка-дызайнерскага праектавання экспазіцыі. Ніжэй пазначана, што ў адпаведнасці з семіятычным падыходам яна разглядаецца як тэкст [12, с. 64–65]. Такім чынам, мы можам вылучыць наступныя важныя для нас вызначэнні паняцця «музейная экс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазіцыя»: гэта, па-першае, форма прэзентацыі музеем спадчыны, па-другое, асаблівы сінтэтычны навукова-мастацкі твор, па-трэцяе, тэкст.

Наконт апошняга вызначэння расійскі даследчык М. А. Нікішын засяроджвае ўвагу на тым, што экспазіцыя складаецца з мноства музейных прадметаў (знакаў і сімвалаў), і экспазіцыя – гэта і есць той тэкст, які павінен «прачытаць» наведвальнік. І толькі дзякуючы ўдаламу падбору экспанатаў, паслядоўнасці іх размяшчэння, групоўкі і камбінавання ў полі зроку музейнага наведвальніка можна звесці розначытанні ва ўспрыманні экспазіцыйнага матэрыялу да дапушчальнага мінімуму, нягледзячы на тое, што кожны музейны прадмет мае сваю сэнсавую прастору і сваё поле значэнняў [10, с. 27].

На працягу 1990–2010 гг. сфарміравалася новае аблічча многіх беларускіх музеяў, у тым ліку гістарычнага і комплекснага профіляў, да якіх можна аднесці агульнагістарычныя, ваенна-гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя і іншыя гістарычныя музеі, а таксама музеі, якія сумяшчаюць прыкметы некалькіх профіляў (мемарыяльныя комплексы, гісторыка-мастацкія, краязнаўчыя музеі, гісторыка-культурныя запаведнікі і г. д.) [7].

Асабліва актыўна развіваліся ў гэты час краязнаўчыя музеі. Да іх ліку можна аднесці Віцебскі абласны краязнаўчы музей, у якім з канца 1980-х гг. вялася актыўная праца па стварэнні філіялаў. У выніку, у 1992 г. быў адкрыты Мастацкі музей, праз год на аснове прыватнага збору віцебскага калекцыянера Івана Галькевіча пачаў працу Музей прыватных калекцый. У 1998 г. быў адкрыты Літаратурны музей, у 2000 г. адбылося адкрыццё музея-сядзібы І. Я. Рэпіна «Здраўнёва». Фактычна тады і сфармавалася сучаснае аблічча Віцебскага абласнога краязнаўчага музея: гэта не адна Ратуша, а цэлы комплекс музеяў [5].

Таксама на працягу 1990-х гг. адбылося абнаўленне экспазіцыі Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е. Р. Раманава [2]. Пастаянныя экспазіцыі ў 2000-х гг. былі створаны ў Доме-музеі I з’езда РСДРП [3], Дзяржаўным музеі тэатральнай і музычнай культуры, якія з 1992 г. і 2014 г. адпаведна з’яўляюцца філіяламі Нацыянальнага гістарычнага музея. Розныя па профілю музеі ў выглядзе філіялаў сабраў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Адным з яго філіялаў з’яўляецца Мастацкі музей, які быў адкрыты ў 2002 г. у Паўднёвай казарме Брэсцкай крэпасці. У аснову філіяла пакладзена калекцыя выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея [13].

Патрабуе асабістай увагі дзеючая экспазіцыя «Музей яўрэйскага супраціву», якая была адкрыта ў 2007 г. на месцы былога гета ў Навагрудку. Экспазіцыя была падрыхтавана супрацоўнікамі Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея на чале з дырэктарам Т. Вяршыцкай, дзякуючы актыўным сувязям з навагрудскай яўрэйскай дыяспарай. Ідэя стварэння экспазіцыі ў тым, каб захаваць памяць пра гераізм звычайных людзей, акцэнтаваць увагу на персанальных гісторыях, адноўленых на аснове сведчанняў саміх вязняў – удзельнікаў уцёкаў і мясцовых жыхароў, аднавіць падзеі ва ўсіх дэталях і паказаць адносіны паміж людзьмі ва ўмовах нацысцкай акупацыі. Такі комплексны падыход да тэмы робіць яе актуальнай для ўсіх і ва ўсе часы, незалежна ад нацыянальнасці і веры [4] .

Змены і аднаўленні экспазіцый былі адзначаны ў дадзены перыяд не толькі ў гэтых краязнаўчых музеях, але і ў многіх іншых (Мсціслаўскім, Крычаўскім, Чачэрскім, Добрушскім, Вілейскім, Капыльскім раённых музеях і інш.).

Аднак асобнае месца сярод музеяў Беларусі гістарычнага і комплекснага профіляў займаюць аб’екты, якія адносяцца да ліку найбольш папулярных сярод турыстаў. Яркімі прыкладамі з'яўляюцца музей «Замкавы комплекс “Мір”», Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Цікавасць з боку наведвальнікаў у апошняе дзесяцігоддзе падштурхнула да змен у экспазіцыях гэтых музеяў.

Адкрыццё асноўнай экспазіцыі музея «Замкавы комплекс “Мір”» адбылося ў снежні 2010 г. Музеефікацыю праводзілі навуковыя супрацоўнікі Нацыяльнага мастацкага музея, філіялам якога на той момант з’яўляўся Замкавы комплекс «Мір». Музеефікацыя праводзілася паэтапна. Згодна з навуковай канцэпцыяй музеефікацыі зроблена рэканструкцыя некалькіх інтэр’ераў: сенцаў і Сталовай ізбы на перыяд канца XVI – пачатка XVII ст., Партрэтнай залы сярэдзіны XVIII ст., пакояў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

князёў Святаполк-Мірскіх канца XIX – пачатка XX ст., якая разглядалася не толькі адносна да музейнага прадмета, але і ўвогуле – да гістарычнага мінулага. У выніку, мэтай музейнай рэканструкцыі стаў не сам прадмет, а тая інфармацыя, якая непарыўна звязана з гістарычным кантэкстам. На думку А. У. Карпенкі, якая кіравала работамі па правядзенні музеефікацыі Замкавага комплексу «Мір», музейныя супрацоўнікі, пачынаючы экспазіцыйную работу са збору і захавання помнікаў, павінны працягваць яе з мастаком-дызайнерам, ад якога шмат у чым залежыць, стане экспазіцыя дакладнай ці не [6]. Рэканструкцыя інтэр’ераў Мірскага замка стала магчымай пры канцэптуальным падыходзе і выкарыстанні сучасных метадаў пабудовы экспазіцыі, у тым ліку па асацыятыўнай прыкмеце.

Навуковы праект музеефікацыі палацавага ансамбля ў Нясвіжы быў распрацаваны ў 2006 г. пры ўдзеле спецыялістаў лабараторыі музейнага праектавання Беларускага інстытута праблем культуры. У 2007 г. былі разгледжаны і зацверджаны навуковая канцэпцыя, тэматыка-экспазіцыйныя планы, а таксама мастацкае рашэнне першага пускавога комплексу. Асновай для аднаўлення інтэр’ераў паслужылі калекцыя фотаздымкаў 1914–1939 гг., а таксама інвентары. Асноўнымі праблемамі музеефікацыі сталі напаўненне экспазіцыі аўтэнтычнымі прадметамі і тэхнічнае абсталяванне залаў. З 2011 г. працоўную групу па музеефікацыі другога пускавога комплексу ўзначаліў дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка «Нясвіж» С. М. Клімаў, да працы былі прыцягнутыя спецыялісты з рэспубліканскіх музеяў. Асноўныя плошчы палаца Радзівілаў былі адкрытыя для наведвання ў чэрвені 2012 г. [11, с. 42–43].

На думку расійскай даследчыцы, доктара мастацтвазнаўства, прафесара М. Ц. Майстроўскай, сучасная экспазіцыя больш, чым калі-небудзь дэманструе сувязь навукі з разнастайнасцю творчых канцэпцый, розных аўтарскіх поглядаў і пазіцый. Дзякуючы ўключэнню ў творчы працэс мастацка-выразных сродкаў, экспазіцыя набывае новую якасць як самастойны мастацкі жанр экспазіцыйнага дызайну. Асаблівае значэнне набывае пабудова экспазіцыйнага вобраза, стварэнне спецыфічнай экспазіцыйнай драматургіі, пошук арыгінальнай мастацка-прасторавай кампазіцыі, аранжыроўка колера-светлавога асяроддзя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацка-функцыянальная якасць экспазіцыі, іншымі словамі, асэнсаванне формы экспазіцыі ў якасці аднаго з найважнейшых аспектаў сучаснага музея [9]. Яркім прыкладам такога падыходу з’яўляецца гістарычная экспазіцыя «Летапіс “Брэсцкай крэпасці”», якая адкрылася 31 студзеня 2019 г. у ДУ «Мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”». Грашовыя сродкі на стварэнне экспазіцыі былі выдзелены Саюзнай дзяржавай. У сямі залах прадстаўлены важныя вехі гісторыі крэпасці на працягу 180 гг. На кожнай панараме маюцца QR-коды – пры дапамозе спецыяльнага дадатку на Android і iOS іх можна прасканаваць і атрымаць інфармацыю пра тую падзею, якая адлюстравана. На думку дырэктара мемарыяльнага комплексу Р. Бысюка, «панарамы з кругавым аглядам, аўтэнтычнымі аконнымі праёмамі і байніцамі ў спалучэнні з гістарычнымі фігурамі, зробленымі ў натуральную велічыню, музычным суправаджэннем, падсветкай, прадаставілі магчымасць не проста быць староннім назіральнікам, а адчуць эфект прысутнасці» [8]. Такім чынам, канцэптуальная і сцэнарная пабудова ўзбагаціла экспазіцыю новымі магчымасцямі, пашырыла дыяпазон актыўнага экспазіцыйнага ўздзеяння на музейнага наведвальніка.

Урачыстае адкрыццё абноўленага Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося 2 ліпеня 2014 г. і стала своеасаблівым прысвячэннем 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтары канцэпцыі ставілі сваёй мэтай стварэнне дынамічнай экспазіцыйнай прасторы з насычанай эмацыйнай атмасферай. Інфармацыйная сістэма экспазіцыі была аформена ў адпаведнасці з найноўшымі распрацоўкамі ў галіне мультымедыйных тэхналогій і музейнага дызайну, што з’яўляецца найважнейшай умовай пашырэння камунікатыўных магчымасцей музея. Уся экспазіцыя пабудавана тэматычнымі блокамі ў храналагічнай паслядоўнасці. Пры стварэнні канцэпцыі экспазіцыі музея і яе архітэктурна-прасторавага рашэння аўтарская група ўлічвала спецыфічны архітэктурны ансамбль новага будынка музея, які складаецца з чатырох блокаў, сімвалізуючых чатыры гады вайны. У выніку, створаная экспазіцыя ўяўляецца не проста зборам гістарычных рэліквій, але і прасторай для ажыўлення гістарычных падзей. Такім чынам, музей пераўтварыўся ў ін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармацыйна-экспазіцыйны комплекс, мэта якога – зрабіць успрыманне экспазіцыі наведвальнікамі больш адраснай, інтэграваць культурны і навуковы патэнцыял музея з патрэбамі сучаснага грамадства [1, с. 49–50].

Такім чынам, на сучасным этапе экспазіцыі многіх беларускіх музеяў гістарычнага і комплекснага профіляў з’яўляюцца асаблівымі сінтэтычнымі навукова-мастацкімі творамі, якія былі створаны ў адпаведнасці з адзінай ідэйнай задумай і на аснове навуковага, сцэнарнага і мастацка-дызайнерскага рашэнняў.


1. *Галинская, А. В.* Научная концепция Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны: история и проектирование экспозиции на современном этапе / А. В. Галинская // История Великой Отечественной войны в современных экспозициях музеев: генезис, проблемы, опыт : сб. материалов межрег. науч.-практ. конф., сост. 8 нояб. 2013 г. в Центральном музее Великой Отечественной войны. – М., 2015. – С. 47–50.

2. Гісторыя Магілёўскага музея 1867–2014 г. [Электронный ресурс] // Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава. – Режим доступа: https://mogilewmuseum.by/gistoryya-muzeya/gstoryya-maglyoskaga-muzeya-1867-2004-g. – Дата доступа: 10.08.2019.

3. Гісторыя музея [Электронный ресурс] // Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. – Режим доступа: http://domusmuseum.histmuseum.by/by/ museum/museum-history/. – Дата доступа: 10.08.2019.

4. Деятельность музея [Электронный ресурс] // Официальный сайт УК «Новогрудский историко-краеведческий музей». – Режим доступа: http://navagrudak.museum.by/node/34901. – Дата доступа: 09.10.2019.

5. История [Электронный ресурс] // УК «Витебский областной краеведческий музей». – Режим доступа: http://ratusha-vit.by/uslugi/istoriya. – Дата доступа: 10.08.2019.

6. *Карпенко, Е.* К вопросу о проблемах реконструкции исторических интерьеров / Елена Карпенко // Мірскі замак: праблемы і шляхі рэалізацыі гістарычнага рэканструявання: навук.-практ. канф., г. п. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, 7 чэрв. 2008 г. / М-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, «Музей «Замкавы комплекс «Мір»; навук. рэд. Н. М. Усава. – Нясвіж, 2012. – С. 8–16.

7. Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступа: 10.08.2019.

8. «Летопись Брестской крепости» – новая историческая экспозиция открылась в цитадели [Электронный ресурс] // Brest Note. Сайт для от-


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыха всей семьей. – Режим доступа: http://brestnote.by/15580-letopis-brestskoy-kreposti-novaya-istoricheskaya-ekspoziciya-otkrylas-v-citadeli-video.html. – Дата доступа: 08.07.2019.

9. *Майстровская, М.* Музейная экспозиция: тенденции развития / М. Майстровская // На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция: теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции: сборник научных трудов / М-во культуры РФ, Российская академия наук, Российский ин-т культурологи. – М., 1997. – С. 7–22.

10. *Никишин, Н.* Музейные средства: знаки и символы / Н. Никишин // На пути к музею XXI века. Музейная экспозиция: теория и практика. Искусство экспозиции. Новые сценарии и концепции: сборник научных трудов / М-во культуры РФ, Российская академия наук, Российский ин-т культурологи. – М. : РИК, 1997. – С. 23–41.

11. *Новицкая, А. В.* К вопросу о музеефикации дворцово-парковых и замковых комплексов Республики Беларусь (1991–2013) / А. В. Новицкая // Веснік БДУ: навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2014. – № 3. – С. 41–45.

12. Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 5. – С. 46–65.

13. Филиал «Художественный музей» [Электронный ресурс] // Брестский областной краеведческий музей. – Режим доступа: http://brokm.by/filial-hudojestvennyi-muzei.html. – Дата доступа: 10.08.2019.

***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ПАБЛІК РЫЛЕЙШНЗ ЯК САЦЫЯЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ Ў ПРАМОЦЫІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПАСЛУГ

Сучасны стан бібліятэчнай справы характарызуецца тым, што бібліятэкі ўжо яўна недастаткова выкарыстоўваюць традыцыйныя формы, метады і рэсурсы для паспяховай рэалізацыі сваёй місіі. З мэтай прыцягнення карыстальнікаў, эфектыўнага ўзаемадзеяння з наваколлем і ў калектыве, уваходжання ва ўсе грамадскія кантэксты спецыялістам бібліятэк неабходна актыўна засвойваць асноўныя элементы прамоцыі паслуг да карыстальнікаў: паблік рылейшнз, рэкламы, індывідуальнай работы і метадаў стымулявання збыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ